3к n1(092)
К89

ПРАЎЛЕННЕ ТАВАРЫСТВА "ВЕДЫ" БЕЛАРУСКАЙ ССР

М.В.Кузняцоў,
доктар гістарычных навук

# ЗМАГАР ЗА НАРОДНАЕ ШЧАСЦЕ

(Да 100-годдзя з дня нараджэння В.Г.Кнорына)

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Президентская Библиотека Республики Беларусь
Ф.К.
Ч/З
КОНТРОЛЬНЫЙ
№248927

Мінск, 1990

Куэняцоў М.В., доктар гістарычных навук.
Змагар за народнае шчасце. (Матэрыял у дапамогу лектару).

Рэцэнзент М.Ф.Шумейка, кандыдат гістарычных навук

© К $\frac{0201000000 - 25}{М\ 347 - 90}$ вн. - 90

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Таварыства "Веды" БССР, 1990.

Шлях, пройдзены савецкІм народам пасля перамогІ ВялІкага КастрычнІка, гераІчны І мужны, цяжкІ І складаны. Сёння многІм эдаецца, што мІнулае не варта перабІраць, уваскрашаць, асэнсоўваць. Маўляў, быццё старых гадоў. Гэтага можна жадаць. здзейснІць жа немагчыма. Стукаюць у сэрца суровыя гады грамадзянскай, смыляць ранамІ векапомныя дні і ночы Вялікай Айчыннай. Няпростым быў І пасляваенны час. Узлёт велІчнай думкІ, але хапала хлуснІ І маны, калІ бессаромна скажалІся марксІсцка-ленІнскІя прынцыпы будаўнІцтва сацыялІзму, дэфармавалася духоўнасць, культура, абражалася чалавечая годнасць. Працэс усталявання праўды патрабуе, каб мы ведалІ ўсё, як было. У Імя таго, каб не паўтарылася тое, за што нам сёння прыкра І сорамна, каб урэшце даведалІся мы, што ўяўлялІ сабой нашы нядаўнІя кумІры І сапраўдныя героІ. "Пралетарыяту патрэбна праўда і аб жывых палітычных дзеячах і аб мёртвых, - адзначаў У.І.Ленін, - бо тыя, хто сапраўды заслугоўвае Імя палІтычнага дзеяча, не памІраюць для палІтыкІ, калІ наступае Іх фІзІчная смерць" [I]. Імкнучыся да ІсцІны, мы не павІнны падобна прытворнай даме падаць у непрытомнасць, трэба цвёрда нарэшце паглядзець праўдзе ў твар, адкІнуўшы прэч фальшывае любаванне ІконамІ, успрымаць вядомых змагароў за ВялІкІ КастрычнІк, за народнае шчасце. Канкрэтна гІстарычна, як звычайных людзей з уласцІвымІ Ім перавагамІ І недахопамІ. ТолькІ пры такІм метадалагІчным падыходзе мы пазбегнем фальшывага ўспрымання асобы, трапяткога стаўлення да яе аўтарытэта, збавІм сябе ад немІнучага расчаравання, якое найбольш ярка, у масавым маштабе праявІлася ў нашы днІ. Неабходна усвядомІць, што богападобнымІ, сталевымІ, самаадданымІ, бессмяротнымІ, непахІснымІ сваІх кумІраў мы зрабІлІ, паказваючы Іх з нІмбам вакол галавы. Самае дзІўнае, што кленчанне перад дутымІ аўтарытэтамІ вядзе да самага глыбокага расчаравання. Таму самымІ лепшымІ лекамІ супраць такога душэўнага крызІсу з'яўляецца народам жа адкалІбраваны афарызм "не ствары сабе кумІра".

Стаўшы ахвярай самападману, трапІўшы ў ганебны палон пустой фразеалогІІ палІтыканаў, народ паступова асэнсаваў, хто ёсць хто, І прасвятлеў розумам.

Новыя гарызонты для правІльнага ўсведамлення айчыннай гІсторыІ, дзейнасцІ рэвалюцыянераў, працоўных мас адкрыла ленІнская партыя, пачаўшы паход за перабудову, дэмакратызацыю грамадскага жыцця Савецкай краІны. Зроблены першы, але знамянальны

[I] Ленин В.И. Полн. собр. соч. Т.20. С.8—9.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

крок. Ён дае магчымасць поўна і праўдзіва паказаць гісторыю Вялікага Кастрычніка, яго рухаючыя сілы, якія адкрылі шлях да сацыялізму.

Важная роля ў рэвалюцыйных падзеях належыць змагарам, якія аб'ядноўваліся вакол Леніна, з ім ішлі на штурм самадзяржаўя, з ім перамаглі. Сярод ленінскай гвардыі знаходзіўся і Вільгельм Георгіевіч Кнорын. Яго лёс, як і лёс тысяч паплечнікаў У.І.Леніна, быў не просты.

Сёння, калі склаліся абставіны для навуковага асэнсавання яго яскравага жыцця і партыйнай дзейнасці, мы гаворым словамі Вальтэра, што "нашай пашаны заслугоўвае той, хто уладарыць над розумамі сілаю праўды, а не тыя, якія насіллем робяць рабоў..."

Вільгельм (Хуга-Вільгельм-Віліс) Георгіевіч (Юрысавіч) Кнорын (Кнорыньш) нарадзіўся 17(29) жніўня 1890 г. у Латвіі на арэндуемым бацькамі хутары Цыелі Скуенскай воласці Цэсі - скага павета Ліфляндскай губерніі. Бацькі жылі бедна. З вялікімі цяжкасцямі, адмаўляючы сабе ў надзённым, ім удалося аддаць сына вучыцца. Віліс палюбіў найбольш літаратуру, творчасць вядомага латышскага паэта Яна Райніса. Пазней, узгадваючы юначыя гады, В.Г.Кнорын пісаў: "Шмат тых, каго ўпершыню заклікаў да рэвалюцыйнай барацьбы Райніс. Да іх належу і я. Можа быць, больш, чым хто іншы, я удзячны Райнісу за той бальшавіцкі дух буры, які ён умеў насаджаць, падрыхтоўваючы ў нашых розумах шлях да ўспрыймання Леніна".

Сігулдскае валаснoе вучылішча В.Г.Кнорын скончыў на "выдатна". Настаўнікі заўважылі здольнасці хлапчука, раілі вучыцца далей. Але грошай не было і Віліс пайшоў працаваць на фабрыку Вісендорфа, дзе зблізіўся з рабочымі, прасякнуўся іх ідэямі.

У 1906 г. з дапамогай настаўніка Веннера, які ведаў здольнасці свайго вучня, Кнорын паступіў вучыцца ў Валмierскую настаўніцкую семінарыю. Тут Віліс упершыню знаёміцца з творамі рэвалюцыянераў-дэмакратаў, чытае працы У.І.Леніна, Г.В.Пляханава, удзельнічае ў рабоце нелегальнага вучнёўскага гуртка, спрабуе пісаць, зрэдку нават друкуецца.

У гэты час ён наладжвае сувязі з рэвалюцыйным сацыял-дэмакратычным гуртком на Лігатнскай папяровай фабрыцы. Увёў туды Віліса бальшавік Карл Ілмерс, з якім наладзіліся цеплыя

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

сяброўскія адносіны, якія не парываліся амаль да апошняга дня жыцця Карла Ілмерса, растралянага калчакаўцамі у 1919 годзе.

1 мая 1910 г. В.Г.Кнорын уступае ў бальшавіцкую партыю.

Пасля заканчэння семінарыі В.Г.Кнорын настаўнічае ў Страўпе, дзе наладжвае гурток рэвалюцыйна настроеных вучняў старэйшых класаў, праводзіць нелегальную прапагандысцкую работу сярод рабочых, сялян, батракоў Страўпе, Пальтэмаля, Цэсіса, Сігулды і іншых населеных пунктаў.

Знаходзячыся ў цэнтры барацьбы, В.Г.Кнорын праяўляе цікавасць да мастацкай літаратуры, піша свае першыя літаратурна-крытычныя артыкулы, выступае ў сацыял-дэмакратычных выданнях як прыкметны публіцыст, прапагандыст марксісцка-ленінскіх ідэй.

Рэвалюцыйная і асветніцкая работа В.Г.Кнорына ўзмацняецца, напаўняецца новым зместам пасля пераезду ў 1913 г. у Рыгу. Рыжскі перыяд жыцця В.Г.Кнорына надзвычай плённы. Ім было напісана каля 100 рэцэнзій і літаратурна-крытычных артыкулаў, цесна звязаных з рэвалюцыйным рухам у Латвіі. Гэта быў перыяд, калі сацыял-дэмакратыя Латвіі ўсё мацней аб'ядноўвалася з бальшавікамі, займаючы перадавыя рэвалюцыйныя пазіцыі. З тых часоў,гаворачы словамі У.І.Леніна, ён цалкам належыць да тых змагароў, якія прысвяцілі сябе толькі барацьбе за вызваленне рабочага класа, якія не растрацілі сябе на марныя тэрарыстычныя прадпрыемствы адзіночак, а дзейнічалі ўпарта, няўхільна сярод пралетарскіх мас, дапамагаючы развіццю іх свядомасці, іх арганізацыі, іх рэвалюцыйнай самадзейнасці.[1]

Лепшым з артыкулаў гэтага часу з'яўляюцца: "Мастацтва і дыялектыка", "Змест і форма", "Песня адной душы (аб творчасці Аспазіі)", "Эміль Верхарн і латышская паэзія". В.Г.Кнорын зазначае, што літаратурная справа ў капіталістычнай Латвіі пакутвае ад анеміі, гэта пустацвет, які нядатны даць паўнацэнныя мастацкія ўсходы. Прычына тоіцца ў ідэйным бяссіллі буржуазнай літаратуры. Выйсце з гэтага тупіка — ва ўсведамленні новага светапогляду, свайго служэння народу, у арыентацыі на творчасць Яніса Райніса, Андрэя Упіта.

Працуючы ў рабочых раёнах Рыгі, В.Г.Кнорын праявіў сябе ўмелым прапагандыстам. Яго выступленні, лекцыі, як сведчаць таварышы па барацьбе, карысталіся вялікай увагай. Тэмы былі самыя разнабаковыя- размічання на выступленні ў культурна-ас-

---

[1] Ленин В.И. Полн. собр. соч. Т.20. С.82.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ветных установах І рабочых таварыствах "Літаратура І жыццё", "Жанчына ў латышскай лІтаратуры І жыццІ", "Законы грамадскага развІцця". Назвы выступленняў пІсалІся так, каб не выклІкаць увагІ ўлад, але слухачы добра разумелІ сапраўдны змест лекцый.

Вядома, гэта не магло не прыцягнуць увагІ палІцыІ. В.Г. Кнорыну пагражае арышт. Пазбегнуць яго дапамагла вайна.

У пачатку першай сусветнай вайны В.Г.Кнорын быў прызваны ў царскую армІю І неўзабаве трапІў на ЗаходнІ фронт, якІ праходзІў па тэрыторыІ БеларусІ. Радавы 50-га запаснога батальёна 32-га эвакуацыйнага пункта В.Г.Кнорын па справах службы бывае ў Варшаве, ГомелІ, ПІнску, Смаленску, МІнску. Гэта дае магчымасць добра ведаць настроІ ў войску, весцІ антываенную прапаганду, падтрымлІваць сувязІ з бальшавІкамІ. Найбольш цесныя сувязІ ў яго наладзІлІся з сацыял-дэмакратычнай ячэйкай у МІнску, у якую ўваходзІлІ Л.РэзаўскІ, К.Ландар, Э.Барэнс І Іншыя бальшавІкІ, добра вядомыя яму па сумеснай працы ў ЛатвІІ. Ад гэтай групы В.Г.Кнорын удзельнІчаў у красавІку 1917 г. у ХШ канферэнцыІ Сацыял-дэмакратыІ Латышскага краю, якая праходзІла ў Маскве. На канферэнцыІ В.Г.Кнорын выступІў па пытанню аўтаномІІ ЛатвІІ, выказаўшыся супраць аддзялення яе ад РасІІ.

У МІнску В.Г.Кнорын пазнаёмІўся з М.В.Фрунзе, С.Г.МагІлёўскІм, І.Я.АлІбегавым, М.І.КрывашэІным, І.К.Ксенафонтавым І многІмІ другІмІ бальшавІкамІ, якІя праводзІлІ дзейсную работу сярод салдат фронта, заваёўваючы Іх на бок рэвалюцыІ. У 1916 г. у 32-м эвакуацыйным пункце В.Г.Кнорын стварае бальшавІцкую групу. У яе уваходзяць М.КрывашэІн, Я.Пярно, Я.Цыруль, П.ЦэльмІнь І Іншыя. Перакананы бальшавІк, ён лІчыў абавязкам кожнага барацьбІта прымаць удзел у рэвалюцыІ І змагацца за яе там, дзе яго паставІў выпадак.

НаблІжалася буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя. З ею бальшавІкІ, прадстаўнІкІ Іншых партый звязвалІ свае надзеІ на карэнныя змены у грамадска-палІтычным І эканамІчным жыццІ РасІІ. У пІсьмах дамоў салдаты пІсалІ: "Усё гатова да рэвалюцыІ.А што рэвалюцыя будзе, дык гэта больш чым верагодна".

ТакІя настроІ падзяляў І В.Г.Кнорын у сваІм пІсьме з МІнска ў снежнІ 1916 года: "Здаецца, тут будзе канец нашаму бадзяжніцтву І тут будзем сядзець да той новай эры..."

У студзенІ 1917 г. В.Г.Кнорын на некалькІ дзён быў адпушчаны дамоў. Па дарозе заскочыў у Пецярбург І, як адзначае ў

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

сваіх успамінах сястра Мільда Юр'еўна, сустрэўся з М.Я.Пярно, якая забяспечыла яго палітычнай літаратурай, дастаўленай ім у Мінск.

У ноч на 2 сакавіка 1917 г. Мінск атрымаў вестку аб падзенні самадзяржаўя. Разам з М.В.Фрунзе,К.І.Ландарам, С.Г. Магілёўскім, прадстаўнікамі салдат В.Г.Кнорын удзельнічае ў паседжанні, якое прыняло рашэнне аб стварэнні Мінскага Савета. 8 сакавіка выбіраецца яго першы выканком. З 22 яго членаў 13 з'яўляюцца бальшавікамі, сярод іх і В.Г.Кнорын.

Мінскі Савет карыстаецца нябачаным аўтарытэтам, становіцца баявым штабам Заходняга фронта, усёй рэвалюцыйнай Беларусі. Яго ўплыў узмацняецца ў маі. В.Г.Кнорына выбіраюць сакратаром выканкома, а пасля — намеснікам старшыні Савета. Працаваць было нялегка, улічваючы многапартыйны састаў выканкома. Ускладняла становішча і тое, што ў Мінску 9 сакавіка 1917 г. па ініцыятыве меньшавікоў і бундаўцаў была створана "аб'яднаная" сацыял-дэмакратычная арганізацыя. В.Г.Кнорын, К.І.Ландар, А.Ф.Мяснікоў імкнуліся стварыць асобна ад меньшавікоў і бундаўцаў бальшавіцкую арганізацыю. Але ў той час ілюзіі аб адзінстве дзеяння падзялялі асобныя бальшавікі, што прымусіла апошніх увайсці 11 сакавіка ў "аб'яднанку", адначасова распачаўшы барацьбу за стварэнне сваёй арганізацыі. Гэта удалося зрабіць летам 1917 г. У пачатку жніўня ў яе ўваходзіла звыш 600 бальшавікоў. Створаны Мінскі камітэт РСДРП(б) узначаліў А.Ф.Мяснікоў. У яго ўвайшоў і В.Г.Кнорын.

Уплыў бальшавікоў на армію павялічваецца. Гэтаму спрыяе работа сярод салдат, якіх выканком Заходняга фронта сабраў у Мінску ў чэрвені 1917 г. на курсы агітатараў. Бальшавікі вядуць сярод іх настойлівую работу. Растлумачваюць мэты сваёй і іншых партый, выкрываюць палітыку Часовага ўрада, паказваюць, каму выгадна і патрэбна вайна.

Праз месяц салдаты сталі пераканаными бальшавіцкімі агітатарамі. Вярнуўшыся на фронт,яны аказваюць на акопнікаў вялікі ўплыў, узнімаюць салдат супраць Часовага ўрада і вайны.

Для правядзення дзейснай работы ў масах патрабавалася свая бальшавіцкая газета. На шляху да яе стварэння было нямала перашкод. Галоўная — не ставала грошай, не мелі бальшавікі сваей друкарні, паперы, кадраў. Руку дапамогі працягнуў ЦК РСДРП(б), выдзеліўшы маладой арганізацыі дзве тысячы рублёў. Друкарню,

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

паперу, рабочых знайшлі на месцы. Газету назвалі "Звезда". В.Г. Кнорын узначаліў у ёй аддзел унутранага і замежнага жыцця, але даводзілася выконваць і шэраг іншых абавязкаў — ад рэдактара да выпускаючага, аўтара і фальцоўшчыка. Пазней, у артыкуле,падпісаным псеўданімам юначых гадоў "Пропрыум", В.Г.Кнорын зазначаў, што хроснай маці нашай "Звезды" была бальшавіцкая пiцерская "Звезда", першы нумар якой выйшаў пры ўдзеле У.І.Леніна. Газета прыйшлася ўсім па душы. І калі не ставала грошай на яе выпуск, на выручку прыходзілі салдаты-акопнікі, рабочыя, сяляне, аддаваўшыя рэдакцыі свае апошнія капітоўнасці.

Любімая простымі людзьмі, "Звезда" была косткай у горле прадстаўнікам мясцовых улад, назначаных Часовым урадам. Газету неаднаразова забаранялі, але яна кожны раз адраджалася пад назвамі "Молот", "Буревестник". Душою гэтых сапраўдных бальшавіцкіх агітатараў з'яўляўся В.Г.Кнорын. Газета дапамагала бальшавікам у верасні 1917 г. аб'яднаць разрозненыя ячэйкі, групы ў адзіны кіруючы цэнтр — Паўночна-Заходні абласны камітэт РСДРП(б).

5—7 кастрычніка 1917 г. В.Г.Кнорын удзельнічае ў П Надзвычайнай Паўночна-Заходняй канферэнцыі, якая прымае шэраг рашэнняў, звязаных з падрыхтоўкай сацыялістычнай рэвалюцыі, выбіраецца ў састаў абласнога камітэта РСДРП(б), прызначаецца рэдактарам газеты "Буревестник". З рашэннямі канферэнцыі звязаны адзін надзвычай цікавы эпізод. Якраз у гэты час, пасля канферэнцыі і напярэдадні вядомага паседжання ЦК РСДРП(б) 10 кастрычніка 1917 г., на якім Я.М.Свярдлоў выступіў з інфармацыяй аб становішчы на Заходнім фронце і ў Мінску, як успаміала Мільда Юр'еўна Кнорына,В.Г.Кнорын на трое сутак прыехаў дамоў.Па дарозе заехаў у Петраград,дзе, па яе меркаваннях,інфармаваў ЦК РСДРП(б) аб рашэннях П Паўночна-Заходняй канферэнцыі і прапанове прыслаць паўстанцам, калі спатрэбіцца, у дапамогу верны корпус.

Сумнявацца няма падстаў. Захавалася пісьмо В.Г.Кнорына,датаванае 10 кастрычнікам 1917 г., пасланае ім у час паездкі са станцыі Валк у рэдакцыю газеты "Латышскі стралок": "Дарагі таварыш! Ахвотна завярнуў бы да Вас, не была б такая шаленая спешка. Зноў абраны ў прэзідыум Савета. І мая прысутнасць неабходна ў Мінску. З сацыялістычным прывітаннем Ваш В.Кнорын".

25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г., яшчэ нічога не ведаючы аб паўстанні, В.Г.Кнорын змясціў на старонках "Буревестни-

ка" напісаную Ім адозву, прасякнутую чаканнем рэвалюцыІ.

Атрымаўшы вестку аб перамозе сацыялІстычнай рэвалюцыІ, В.Г. Кнорын, А.Ф.МяснІкоў, К.І.Ландар падрыхтавалІ загад № І аб пераходзе ўлады ў МІнску ў рукІ МІнскага Савета рабочых І салдацкІх дэпутатаў.

Для падтрымкІ паўстання стварылІ першы рэвалюцыйны Імя МІнскага Савета полк.

Прынятыя загады аказалІся своечасовымІ, бо камандаванне фронта, апамятаўшыся ад разгубленасцІ першых дзён, пачало сцягваць у МІнск свае войскІ, разам са згоднІцкІмІ партыямІ стварыла КамІтэт "выратавання" рэвалюцыІ.

В.Г.Кнорын, А.Ф.МяснІкоў, К.І.Ландар у гэтых абставІнах праявІлІ палІтычную вытрымку І мудрасць, цвёрдасць І волю да ўзважанага кампрамІса. Пад прыкрыццём перагавораў са згоднІкамІ яны ІнфармавалІ аб пагрозе з боку контррэвалюцыІ салдацкІя камІтэты фронта, якІя не дапусцІлІ звяржэння Савецкай улады ў МІнску, аказалІ ў рашаючы момант патрэбную дапамогу.

У.І.ЛенІн высока ацанІў дзейнасць бальшавІкоў БеларусІ. Гэта было І прызнаннем працы В.Г.Кнорына. "НІ аб якІм супрацІўленнІ з боку армІІ супраць КастрычнІцкай рэвалюцыІ пралетарыята, супраць заваявання палІтычнай улады пралетарыятам не магло быць І гаворкІ, -- пІсаў У.І.ЛенІн, -- калІ на Паўночным І ЗаходнІх франтах у бальшавІкоў была гІганцкая перавага" [1].

Пасля перамогІ ВялІкага КастрычнІка В.Г.Кнорын працаваў камІсарам друкарняў МІнска, прымаў актыўны ўдзел у стварэннІ Абласнога выканаўчага КамІтэта Саветаў Заходняй вобласцІ І фронта (Аблвыкамзах), з'яўляўся кіраўніком яго спраў.

Дакументаў гэтае пары, на жаль, засталося вельмІ мала, каб раскрыць дзейнасць В.Г.Кнорына на вызначаных пасадах, але, мяркуючы па яго кнІгах, напІсаных пазней, можна зрабІць вывад, што ўжо ў першыя месяцы Савецкай улады прадпрымалІся крокІ па аднаўленню работы прадпрыемстваў МІнска, забеспячэнню харчаваннем, палІвам. У вёсцы распаўсюджваецца Дэкрэт аб зямлІ, прымаюцца захады па стварэнню на базе памешчыцкіх маенткаў савецкІх гаспадарак.

Плённую працу спынІла наступленне германскІх войск, распачатае ў лютым 1918 г. В.Г.Кнорын у гэты час з'яўляецца старшынею МІнскага камІтэта РСДРП(б). Перад адступленнем фармІруе мІн-

---

[1] Ленин В.И. Полн. собр. соч. Т.40.С.10.

скую падпольную арганIзацыю, улIваючы ў яе самых вытрыманых I адданых рэвалюцыI таварышаў.

У канцы лютага 1918 г.партыйныя і савецкія установы Заходняй вобласці эвакуіраваліся ў Смаленск.Абласны камітэт партыі дару-чыў В.Г.Кнорыну рэдагаванне "Звезды", акрамя таго, разам з В.А.БагуцкIм I I.Я.АлIбегавым кIруе падпольнымI арганIзацыямI на захопленых немцамI тэрыторыях. У канцы лютага 1918 г. В.Г. Кнорын сустрэўся з групай будучых падпольшчыкаў. Сярод Iх былI П.М.Серабракоў I П.Ф.РэвIнскI. Ён расказаў таварышам аб будучай рабоце, прыёмах канспIрацыI, вучыў не губляцца ў складаных абставIнах. У парадах дапамагаў вопыт, набыты В.Г.Кнорыным у ЛатвII, дзе не аднойчы яму даводзIлася вадзIць фIлераў за нос, Iсцi на рызыку I хIтрасць, каб пазбегнуць арышту, не трапIць за краты. ДамовIлIся аб вядзеннI агIтацыI сярод нямецкIх салдат шляхам распаўсюджання лIстовак на нямецкай мове, стварэннI партызанскIх атрадаў. "Пасля гэтай гутаркI,-успамIнаў П.М.Серабракоў,- я адчуў вялIкую ўпэўненасць у ажыццяўленні пастаўленых задач" [I].

Абстаноўка ў Смаленску была складанай, непадалеку ад горада пралягала дэмаркацыйная лIнIя, якая раздзяляла савецкIя I германскIя войскI. Займацца даводзIлася ўсIмI справамI, якIя падказвала жыццё: В.Г. Кнорын быў ваенным камIсарам вайсковай акругI, як сакратар абласнога камIтэта партыI наладжваў I кантраляваў выкананне прынятых рашэнняў. Працуе суткамI, сёстры МIльда Юр'еўна I Зельма Юр'еўна расказвалI аўтару гэтых радкоў, што яго нельга было убачыць недзе на канкрэтным месцы, ён знаходзIўся ўсюды, дзе працавалI людзI, дзе патрабавалIся падтрымка пераканаўчым словам, натхняючым прыкладам. У горадзе скончылася палIва — выязджаў разам з рабочымI на лесанарыхтоўкI, патрабавалася харчаванне — звяртаўся да сялян, не хапала параненым I хворым медыкаментаў — клапацIўся I аб гэтым.

Як I Iншых кIраўнIкоў Паўночна-Заходняга абкома РСДРП(б), В.Г.Кнорына хвалявалI I пытаннI культуры, аховы помнIкаў мIнулага I твораў мастацтва. ЛюдзI жылI галадна, можна сказаць, аднымI спадзяваннямI. А да мастацтва цягнулIся, хацелI зберагчы, захаваць тое, што вывезлI з панскIх маёнткаў I што, можа,

---

I З успамIнаў П.М.Серабракова, якIя захоўваюцца ў музеI Страўпскай школы ў ЛатвII.

ўпершыню адкрылася простым людзям. Прызначаны ў красавIку 1918 г. загадчыкам аддзела мастацтва Аблвыканкома, В.Г.Кнорын спецыяльнай пастановай узяў пад ахову помнIкI дойлIдства, архIвы, народныя каштоўнасцI.

Пры яго актыўным удзеле адкрывалIся школы, падбIралIся кадры настаўнIкаў, рабIлася ўсё магчымае па барацьбе з непIсьменнасцю. В.Г.Кнорын лIчыў, што "невуцтва, неразуменне навакольнага жыцця,- гэта адна з самых вялIкIх перашкод да удзелу ў палIтычным жыццI I да правIльнага разумення задач моманту" [1].

У гэты надзвычай напружаны перыяд ва ўсю шыр раскрыўся публIцыстычны талент В.Г.Кнорына. Ён рэдагуе газету "Бедняк", другIя выданнI, амаль кожны дзень выступае з артыкуламI па надзенных пытаннях. Сёння яны праўдзIва расказваюць, якIм напружаным было яго жыццё. На У Паўночна-Заходняй канферэнцыI В.Г. Кнорын выступае з дакладам, у кастрычнIку 1918 г. прымае удзел у склIканай ЦК РКП(б) у Маскве канферэнцыI камунIстычных арганIзацый Польшчы, БеларусI, ЛIтвы, ЛатвII, ЭстонII, ФIнляндыI, чытае ў партыйнай школе курс лекцый па гIсторыI партыI.

НадыходзIць лIстапад 1918 г. Пад уздзеяннем рэвалюцыI ў ГерманII нямецкIя войскI пакIдаюць Беларусь.

10 снежня 1918 г. Чырвоная АрмIя ўвайшла ў МIнск. СкладвалIся магчымасцI для рэалIзацыI "ДэкларацыI правоў працоўнага I эксплуатуемага народа" I самаўладкавання беларусаў. ПытаннI гэтыя вырашалIся складана, I працяглы час В.Г.Кнорын не мог як мае быць у Iх разабрацца. УзнIклI ж яны амаль што адразу пасля перамогI КастрычнIка. Гэтыя цяжкасцI склалIся ў вынIку Iмкнення нацыянальных сIл да ўтварэння самастойнай буржуазна-дэмакратычнай рэспублIкI. БальшавIкI ж не толькI не IмкнулIся да стварэння Беларускай рэспублIкI на савецкай аснове, але памылкова лIчылI гэта непатрэбным. Ажыццяўленне " ДэкларацыI правоў працоўнага I эксплуатуемага народа" для БеларусI яны бачылI ва ўваходжаннI яе ў састаў РСФСР у якасцI абласной адзIнкI. Такое вырашэнне пытання, на думку В.Г.Кнорына, А.Ф.МяснIкова, М.В.РагазIнскага, Iншых кIраўнIкоў Заходняй вобласцI, а пазней I Заходняй камуны, выцякала з этнIчнай, культурнай, духоўнай блIзкасцI беларусаў I рускIх, раз'яднанне, размеркаванне якIх па нацыяна-

---

[1] Кнорин В.Г. Задачи текущего дня //Известия Исполнительного комитета Советов Западной области и Смоленского Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов. 1918. 16 июня.

льных "кватэрах" яны лІчылІ штучным, надуманым. Вядома, такІ памылковы погляд пярэчыў марксІсцка-ленІнскІм палажэнням. У.І. ЛенІн указваў, што ў вынІку перамогІ сацыялІстычнай рэвалюцыІ Савецкая ўлада здзейснІць "неадкладнае аднаўленне поўнай свабоды для ФІнляндыІ, УкраІны, БеларусІ..." [I].

Памылковыя погляды В.Г.Кнорына былІ абумоўлены таксама тым, што ў партыІ, яе кІраўнІцтве мелІ месца розныя падыходы да права нацыІ на самавызначэнне. У артыкуле "Самавызначэнне народаў І дыктатура пралетарыята" ён пІша, што самавызначэнне адыграла сваю рэвалюцыйную ролю на этапе барацьбы за сацыялІстычную рэвалюцыю. З заваяваннем Савецкай улады патрабаванне самавызначэння народаў, на яго погляд, стала патрабаваннем рэакцыйным, накІраваным супраць пралетарыята, І прапанаваў лозунг самавызначэння народаў "выкрэслІць з праграмы Савецкай РасІІ" [2]. ЛенІнскІх адносІн да права нацый на самаўладкаванне не адразу зразумелІ яго паплечнІкІ Ф.Э.ДзяржынскІ І М.І.Бухарын, якІя на красавІцкай канферэнцыІ выступІлІ супраць гэтых палажэнняў.Г.Л. Пятакоў жа наогул адмаўляў гранІцы, сцвярджаючы, што нацыянальная дзяржава — пройдзены этап, што самаўладкаванне пры капІталІзме немагчыма, пры сацыялІзме — лІшняе.

Белнацком, беларускІя камунІстычныя секцыІ РКП(б) па гэтых пытаннях занялІ пазІцыю, адпавядаючую Імкненням беларускага народа на самавызначэнне пад савецкІм сцягам. Яны прапаноўвалІ перайменаваць Заходнюю вобласць у Беларуска-ЛІтоўскую камуну цІ аўтаномную рэспублІку ў саставе РСФСР. В.Г.Кнорын выступІў з крытыкай гэтых прапаноў, неабгрунтавана абвІнавацІў прадстаўнІкоў беларускІх камунІстычных секцый у нацыяналІзме. "На гэты раз ахвяраю нацыяналІзму палІ нашы таварышы, ураджэнцы беларускага краю, якІя пражываюць у Пецярбургу, Маскве І г.д. Яны забылІся,- пІсаў В.Г.Кнорын,- што яны камунІсты, І далІ магчымасць ІдэалогІІ дробнай буржуазІІ ў сваІх галовах узяць верх над ІдэалогІяй пралетарскай" [3].

ПалемІка памІж кІраўнІцтвам Паўночна-Заходняга камІтэта РКП(б) І работнІкамІ Белнацкома, беларускІх камунІстычных сек-

[I] Ленин В.И. Полн. собр. соч. Т.34. С.299.

[2] Звезда. I9I8. I2 июня.

[3] Там же. I2 сентября.

цый РКП(б) абвастралася. Іншы раз яна насІла характар неабгрунтаванай крыўды І зняваґІ, што, вядома ж, не спрыяла высвятленню разыходжанняў. Усе яны разам рабІлІ адну справу — абаранялІ рэвалюцыю, Савецкую ўладу, ствараючы прадумовы для наладжвання новага жыцця І зрабІлІ важкІ ўклад у наблІжэнне ўтварэння БССР. Але ў кастрычнІку 1918 г. яны гэтага яшчэ не разумелІ. Паўночна-ЗаходнІ камІтэт РКП(б) вуснамІ свайго сакратара В.Г. Кнорына заяўляў: "Мы лІчылІ, што беларусы не з'яўляюцца нацыяй І што тыя этнаграфІчныя асаблІвасцІ, якІя Іх аддзяляюць ад астатнІх рускІх, павІнны быць зжыты. Нашай задачай з'яўляецца не стварэнне новых нацый, а знІшчэнне старых нацыянальных рагатак"[I].

У гэтых меркаваннях знайшлІ адлюстраванне погляды многІх тагачасных кІраўнІкоў, якІя спадзявалІся, што пад уплывам ВялІкага КастрычнІка І перамог у грамадзянскай вайне пачнецца сусветная рэвалюцыя, якая ўшчэнт знІшчыць старыя формы нацыянальных размежаванняў І пакладзе пачатак адзІнай сацыялІстычнай рэспублІцы.

З улІкам таго, што спадзяваннІ на сусветную пралетарскую рэвалюцыю з'яўлялІся палІтычнай лІнІяй РКП(б), пазІцыя В.Г.Кнорына, аднаго з аўтарытэтных кІраўнІкоў ВялІкага КастрычнІка ў БеларусІ І на ЗаходнІм фронце, сакратара Паўночна-Заходняга камІтэта РКП(б), адпавядаючая гэтай лІнІІ, ускладняла барацьбу тых, хто празорлІва, без рамантычнага рэвалюцыянарызму бачыў нязбытнасць такІх палажэнняў, рэальна глядзеў на праблемы з утварэннем Беларускай Савецкай СацыялІстычнай рэспублІкІ.

СавецкІ ўрад скасаваў БрэсцкІ дагавор. У.І.ЛенІн,ЦК РКП(б) згадзІлІся з прапановамІ канферэнцыІ беларускІх камунІстычных секцый РКП(б) аб самавызначэннІ БеларусІ І стварэннІ Беларускага Савецкага ўрада. Не захавалася дакументаў, якІя б расказвалІ пра рэагаванне В.Г.Кнорына на гэтае рашэнне. Але можна меркаваць, што ён, як дысцыплІнаваны член партыІ, прыняў да выканання новую лІнІю.

В.Г.Кнорын уключыўся ў падрыхтоўку УІ Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыІ РКП(б).

Канферэнцыя адбылася ў Смаленску. Яна аб'явІла аб утварэннІ самастойнай СацыялІстычнай Савецкай РэспублІкІ БеларусІ.

---

[I] Звезда. 1918. 6 октября.

Канферэнцыя абвясцIла сябе I з'ездам КампартыI БеларусI. В.Г. Кнорын выступIў з дакладам аб дзейнасцI абласнога камIтэта партыI, падкрэслIўшы выключнасць самавызначэння БеларусI.

З'езд зацвердзIў Часовы рэвалюцыйны рабоча-сялянскI ўрад БеларусI, выбраў Цэнтральнае Бюро КП(б)Б. Старшынёй ЦБ быў абраны А.Ф.МяснIкоў, сакратаром ЦБ — В.Г.Кнорын.

У пачатку студзеня I9I9 г. урад рэспублIкI, ЦБ КП(б)Б пераехалI ў МIнск. В.Г.Кнорыну даручылI адналенне I рэдагаванне "Звезды", ён штодзень займаецца пытаннямI падрыхтоўкI I Усебеларускага з'езда Саветаў, выязджае ў аддаленыя вёскI. Але мIрная перадышка заканчвалася. Буржуазна-памешчыцкая Польшча пачала рыхтавацца да вайны супраць КраIны Саветаў. Каб процIстаяць новаму ворагу, Беларуская ССР I ЛIтоўская ССР, а таксама Iх КампартыI прынялI рашэнне аб аб'яднаннI. У сакавIку I9I9 г. аб'яднальны з'езд абраў ЦК КампартыI ЛIтвы I БеларусI(КП(б)ЛIБ), у яго ўвайшоў у якасцI сакратара ЦК I В.Г.Кнорын. СтановIшча пагаршаецца. Зноў В.Г.Кнорын адбIрае камунIстаў для падполля, зноў усе жыццё ЛIтоўска-Беларускай ССР падпарадкоўваецца патрэбам вайны. Пасля жорсткIх баёў пакIнуты ВIльня, МIнск. ЦК КП(б)ЛIБ пераязджае ў Смаленск. Бюро нелегальнай работы,у якIм працуе В.Г.Кнорын, накIроўвае работу падпольшчыкаў, падтрымлIвае цесныя сувязI з партызанскIмI атрадамI. КамунIсты горада выбIраюць яго старшынёю Смаленскага павятова-гарадскога камIтэта партыI, займаецца правядзеннем тыдняў фронта, забеспячэннем войск зброяй, харчаваннем, адзеннем.

Вясной I920 г. становIшча на савецка-польскIм фронце пачынае паляпшацца. Чырвоная АрмIя перайшла ў наступленне I II лIпеня вызвалIла МIнск. У МIнску ствараецца Рэўком ССРБ, у якI ўвайшлI В.Г.Кнорын, А.Р.Чарвякоў, I.А.АдамовIч. У канцы лIпеня В.Г. Кнорын разам з іншымі падпісвае гістарычны дакумент – Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі.Кампартыі Літвы і Беларусі зноў становяцца самастойнымі арганізацыямі ў саставе РКП(б).В.Г.Кнорын выбіраецца сакратаром Цэнтральнага Бюро КП(б)Б. 22 лIстапада I920 г. адбыўся Ш з'езд КП(б)Б. Выступаючы на Iм з дакладам, В.Г.Кнорын заклIкаў камунIстаў, усIх працоўных аднаўляць прамысловасць, уздымаць сельскую гаспадарку, залечваць раны вайны.

У мIрным будаўнIцтве ён вялIкую ролю адводзIў моладзI, таму шмат увагI ўдзяляў камсамолу. У I92I г., у час работы П

з'езда камсамола БеларусI выйшла камсамольская газета "Чырвоная змена". Сваёй назвай, як I выхадам у доўгае маладое жыццё, "Чырвонка" абавязана В.Г.Кнорыну. ЭнтузIязм рабочых, сялян, IнтэлIгенцыI ў тыя 20-я гады быў проста неверагодны, таму I вынIкI аднаўлення здзIўлялI. ПачалI даваць першую прадукцыю заводы, здымалIся першыя беларускIя фIльмы, адкрыўся Iнстытут беларускай культуры, якI паклаў пачатак АкадэмII навук БССР. У лIпенI 1921 г. адкрыўся БеларускI дзяржаўны ўнIверсIтэт, БеларускI педагагIчны тэхнIкум. В.Г.Кнорын збIраў для яго кадры выкладчыкаў, клапацIўся аб кнIгах, жыллI для выкладчыкаў.

Жыццё рэспублIкI адраджалася на вачах. МелIся значныя зрухI I ў эканомIцы, I ў культуры. Гэта натхняла на работу.

У маI 1922 г. ЦК РКП(б) перавёў В.Г.Кнорына ў Маскву. Спачатку ён узначальваў улIкова-размеркавальны, а потым Iнфармацыйны аддзелы ЦК РКП(б), у 1925 г. працуе загадчыкам агIтацыйна-прапагандысцкага аддзела Маскоўскага губкома партыI, а ў 1926 г. узначальвае гэты аддзел у ЦК ВКП(б). Кругагляд В.Г.Кнорына пашыраецца, ён многа пIша па надзённых пытаннях IдэалагIчнага жыцця, цIкавIцца лIтаратурай, мастацтвам.

У 1927—1928 гг. ЦК ВКП(б) накIроўвае яго зноў у Беларусь. РэспублIка развIвае прамысловасць, на аснове кааперацыI робIць упэўненыя крокI вёска. Як сакратар ЦК КП(б)Б, В.Г.Кнорын Iмкнецца ва ўсе ўнIкнуць, падтрымаць новае, перадавое. ДзейнIчае спакойна, разважлIва. Былыя непаразуменнI з самавызначэннем БеларусI зжыты канчаткова I беспаваротна. Ён шчыра радуецца поспехам, новым матывам у творчасцI ЯнкI Купалы, Якуба Коласа, МIхася Чарота, Кузьмы Чорнага, УладзIмIра ДубоўкI.

Чалавек разнабаковых Iнтарэсаў I багатых ведаў, В.Г.Кнорын не абмяжоўваўся партыйна-палIтычнай работай, меў патрэбу выступIць у друку з актуальным публIцыстычным артыкулам, добра ведама, што ён не палIчыў пагрозай свайму аўтарытэту, калI яму прапанавалI ў пачатку 20-х гадоў здымацца ў першым героIка-рамантычным фIльме "Лясная быль", падтрымаць тым самым творчыя пошукI маладога тады рэжысера Юрыя Тарыча.

У фIльме быў сюжэт, звязаны с падзеямI лIпеня 1920 года, калI дзейнIчаў Рэўком. ЗгадзIўшыся здымацца ў гэтым сюжэце, В.Г. Кнорын заахвоцIў удзельнIчаць у Iм А.Р.Чарвякова I I.А.АдамовIча. ФIльм захаваўся, цяпер адрэстаўрыраваны I красамоўна расказвае аб вызваленнI БеларусI ад легIянераў. Плённа працаваў В.Г.

Кнорын I над гIсторыка-партыйнымI даследаваннямI. Выкладчыкаў ва ўнIверсIтэце не хапала, I ён па просьбе рэктарата, а таксама са згоды ЦК КП(б)Б чытаў курс лекцый па эканомIцы, гIсторыI партыI. Надзвычай заняты, але прагны да жыццёвых спраў, ён мэў вялIкую патрэбу расказаць моладзI пра падзеI, звязаныя з ВялIкIм КастрычнIкам. Яшчэ ў I9I9 г. ён разам з А.Ф.МяснIковым працаваў над зборнIкам артыкулаў па фIласофII. Пасля грамадзянскай вайны выйшлI яго працы "Рэвалюцыя I контррэвалюцыя ў БеларусI", "Пяць год. КароткI канспект гIсторыI КП(б)Б", "I9I7 год у БеларусI I на ЗаходнIм фронце", "ЗаметкI да гIсторыI дыктатуры пралетарыята", шэраг Iншых работ.

Расказваючы аб гэтым, пажадана, каб лектары звязалI паказ навуковай дзейнасцI В.Г.Кнорына з работай партыI ў гэты час па збору дакументаў I матэрыялаў па пытаннях рэвалюцыйнай барацьбы працоўных. Дарэчы, сабраныя ў БеларусI дакументы, асабIстыя рэчы змагароў саставIлI экспазIцыю музея КастрычнIцкай рэвалюцыI, якI быў адкрыты ў МIнску. У МIнску пачаў працаваць Iнстытут гIсторыI партыI (Iстпарт).

Аддаючы сябе справе развIцця народнай гаспадаркI, культуры БеларусI, В.Г.Кнорын падтрымлIваў цесныя сувязI з латышскIмI сябрамI. Iх было многа ў БеларусI, у Маскве. У час, калI ў ЛатвII ўсталявалася буржуазная ўлада, тысячы латышоў працавалI ў Савецкай РасII, мелI свае тэатры, выдавалI лIтаратуру на роднай мове. В.Г.Кнорын па просьбе таварышаў прымаў удзел у падрыхтоўцы да выдання I0-томнага збору твораў У.I.ЛенIна на латышскай мове, часта выступаў з артыкуламI ў латышскIх газетах. У I928 г. ён узначалIў камIсIю ЦК КП(б)Б па выданню I2-томнага збору твораў У.I.ЛенIна на беларускай мове. Паспеў выйсцI толькI трэцI том. За пленную працу ў БеларусI В.Г.Кнорын быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага сцягу.

Пройдзены рэвалюцыйны шлях, неблагая тэарэтычная падрыхтоўка, веданне нямецкай, французскай моў вылучылI В.Г.Кнорына да удзелу ў мIжнародным рэвалюцыйным руху. У I928 г. на VI кангрэсе КамIнтэрна ён быў выбраны ў члены выканкома КамIнтэрна (ВККI). Як член СярэднееўрапейскагА бюро ВККI, В.Г.Кнорын прымаў непасрэдны удзел у рабоце кампартый Заходняй БеларусI, Польшчы, ЧэхаславакII, ГерманII, АўстрыI. Вядомы дзеяч КампартыI Заходняй БеларусI I КампартыI Польшчы М.С.Арэхва, якI добра ведаў В.Г.Кнорына па сумеснай барацьбе, расказваў аўтару аб

вялікім аўтарытэце В.Г.Кнорына сярод рэвалюцыянераў, яго аратарскім таленце, уменні пераканаць слухачоў, запаліць у іх веру ў перамогу.

Член Палітсакратарыята ВККІ, паплечнік Г.Дзімітрава,Э.Тэльмана, П.Тальяцці, М.Тарэза, В.Г.Кнорын добра ведаў кіраўнікоў працоўных Польшчы, разам з імі шмат зрабіў, каб адцягнуць другую сусветную вайну. Дзейнічаць даводзілася ў складаных умовах жорсткага даўлення Сталіна на прадстаўнікоў ВКП(б) у Камінтэрне В.Г.Кнорына, Д.З.Мануільскага, О.А.Пятніцкага і іншых. Бываючы ў краінах Заходняй Еўропы, сустракаючыся з кіраўнікамі камуністычных і рабочых партый, В.Г.Кнорын бачыў, што для прадухілення вайны патрэбна адзінства ўсіх міралюбівых сіл, новая стратэгія. Упэўніць у гэтым Сталіна не удавалася, ён па-ранейшаму бачыў у сацыял-дэмакратыі Захаду ворагаў рабочага класа і не дапускаў ніякага кампрамісу. Ён тварыў сваю палітыку, заснаваную на яго бачанні расстаноўкі класавых сіл. Спатрэбіўся УП кангрэс Камінтэрна, каб Сталін нарэшце зразумеў памылковасць сваіх поглядаў. Але ён не хацеў прызнаць сваіх хібаў, як і ў іншых пытаннях, Сталін знайшоў вінаватых сярод членаў ВККІ. Мільда Юр'еўна ўспаміНала, што В.Г.Кнорын, О.А.Пятніцкі, іншыя работнікі ВККІ позним вечарам адпраўляліся да Сталіна і работа працягвалася да раніцы. Абмяркоўваліся рэзалюцыі УП кангрэса. Кожная старонка рэзалюцый захоўвала сляды абмеркаванняў.Пераканаць Сталіна было немагчыма.Калі ж В.Г.Кнорын і О.А.Пятніцкі заявілі, што так далей працаваць нельга, Сталін сказаў: "Не хочуць, не трэба, абыйдземся без іх." І яны больш не ўвайшлі у ВККІ.

Сталін не любіў асоб з пачуццём уласнай годнасці. У кожным бачыў патэнцыяльнага здрадніка і шпіёна. II лютага 1937 г. ён сказаў Г.Дзімітраву: "Усе вы там, у Камінтэрне, працуеце на руку праціўніку".

Х.Ракоўскага ён назваў англійскім, В.Г.Кнорына -- нямецкім і польскім шпіёнам, Б.Куна -- памагатым усіх варожых разведак. І ні да кога не меў літасці. "...Мы будзем знішчаць кожнага такога ворага, (хаця б) быў ён і старым бальшавіком, мы будзем знішчаць увесь яго род, яго сям'ю. Кожнага, хто сваімі дзеяннямі і думкамі, так, і думкамі, спакушаецца на адзінства сацыялістычнай дзяржавы, нашчадна будзем знішчаць".

При раскрыцці дзейнасці В.Г.Кнорына ў ВККІ раім лектарам асвятліць таксама праблему роспуску Камінтэрна.

М 248927

АдхIленне ад працы ў ВККI, а больш за ўсё недавер'е, з'явIлIся для В.Г.Кнорына вялIкIм ударам. Але В.Г.Кнорын выстаяў. Ён знайшоў прымяненне сваей энергII I ведам. Яшчэ ў 1931 г., адказваючы на пытаннI анкеты пры ўступленнI ў таварыства старых бальшавIкоў "у чым маеце патрэбу, чым можна палепшыць не толькI здароўе, але I вашу здольнасць да барацьбы за нашы Iдэалы?", — ён адказаў: "НI ў чым не маю патрэбы, акрамя часу для работы". I гэта было так, хаця атрымлIваемы Iм партмаксIмум быў надзвычай сцIплы пры яго сям'I з дзвюма дзецьмI ды старымI бацькамI. Але такI ён быў чалавек! Так, часу цяпер у яго было ...крыху больш. СталIн, выключыўшы В.Г.Кнорына з ВККI, жадаючы, вIдаць, абразIць, назначыў яго намеснIкам загадчыка агIтпрападдзела ЦК ВКП(б). В.Г.Кнорын сканцэнтроўвае сваю працу ў Iнстытуце чырвонай прафесуры, якI узначальваў з 1932 г. Ён чытае курс "ГIсторыя ВКП(б)", разам з IншымI таварышамI працуе над вывучэннем праблем гIсторыка-партыйнай навукI. У 1934 г. пад рэдакцыяй В.Г.Кнорына выходзIць "Кароткая гIсторыя ВКП(б)", падрыхтаваная навуковымI супрацоўнIкамI Iнстытута чырвонай прафесуры Ф.Андэрсонам, М.ВайцIнскIм, Г.КрывIцкIм, А.КучынскIм пад кIраўнIцтвам Б.М.Панамарова. Яму прысуджаецца вучоная ступень доктара гIстарычных навук I званне прафесара. Разам з IншымI вучонымI В.Г.Кнорын натхнёна працуе над "ГIсторыяй ВКП(б)" у двух тамах. Ужо былI падрыхтаваны сIгнальныя экзэмпляры. Але тамы так I не выйшлI. МIльда Юр'еўна, якая шмат гадоў свайго жыцця аддала вывучэнню навуковай спадчыны брата, напIсала, што "галоўным недахопам гэтых кнIг лIчылася тое, што там недастаткова падкрэслIвалася роля СталIна" [1]. Па далёка няпоўных падлIках МIльды Юр'еўны I Зельмы Юр'еўны Кнорыных, зробленых з дапамогай жонкI ВIльгельма ГеоргIевIча НIны Аляксандраўны, вядома 25 кнIг I брашур, звыш 640 артыкулаў у часопIсах I газетах, у тым лIку каля 150 лIтаратурна-крытычных нарысаў I рэцэнзIй [2].

Творчы набытак В.Г.Кнорына надзвычай багаты. Ён з'яўляецца членам рэдкалегII газеты "Праўда", добра ведаў Марыю IльIнI-

---

[1] З успамIнаў М.Ю.Кнорынай, што захоўваюцца ў архIве аўтара.

[2] Кнорина М.Ю. Вильгельм Георгиевич Кнорин (Биографические сведения). - Рига, 1969. С.27.

чну Ульянаву I Надзежду КанстанцIнаўну Крупскую, захаваўся цудоўны здымак з ею на УП кангрэсе КамIнтэрна, друкаваўся ў часопIсах "Большевик", "Коммунистический Интернационал", "Ротэ Фанэ", "Новы Пшэглёнд" I многIх Iншых. Большасць з яго навуковых, публIцыстычных прац вытрымалI выпрабаванне часам. На асобных жа ляжыць адбIтак часу I абумоўлены аўтарытарна-бюракратычнымI метадамI кIраўнIцтва, але I праз рытарычна-хвалебныя радкI не-не ды прабIваецца светлая думка, прасякнутая сапраўдным клопатам пра чалавека, верай у яго толькI светлы лёс. Мы не можам сёння ставIць яму гэта ў вIну. Ён жыў у свой час,змагаўся, працаваў, як мог. Так, памыляўся, пакутваў, але нIколI не здраджваў сацыялIстычным Iдэалам, свайму народу.

В.Г.Кнорын карыстаўся высокIм аўтарытэтам у партыI. Ён на працягу многIх гадоў выбIраўся ў састаў ЦК ВКП(б), у кIруючыя органы КампартыI БеларусI, ЛIтвы I ЛатвII. У маI I937 г. ЦК ВКП(б) даручыў В.Г.Кнорыну, Я.М.Яраслаўскаму, П.М.Паспелаву падрыхтоўку кароткага падручнIка па гIсторыI партыI.

В.Г.Кнорын настойлIва працаваў над сваей часткай. 22 чэрвеня I937 г. быў звычайны цёплы, сонечны летнI дзень. Па сумесных справах прыехаў П.М.Паспелаў. Гаворка Iшла пра работу.Хутка ён развIтаўся.

Увесь дзень на дачы ў Кнорыных гасцявала Марта, жонка Клемента Готвальда, генеральнага сакратара КампартыI ЧэхаславакII. Разам з НIнай Аляксандраўнай яны гулялI па лесе, радавалIся лету. Вечарам ВIльгельм ГеоргIевIч, Iх госця, НIна Аляксандраўна I МIльда Юр'еўна сядзелI на лузе, гутарылI, жартавалI, смяялIся. Недзе побач гулялI дзецI Кнорыных Майя I Юра.Усе было так мIрна I хораша. Яны цепла развIталIся з Мартай.

А ноччу завIталI няпрошаныя госцI. Пачаўся бесцырымонны вобыск, ляцелI напIсаныя лIсты будучага падручнIка гIсторыI партыI... ВIльгельм ГеоргIевIч сказаў вайскоўцам: "Гэта ж падручнIк, навошта ж так кIдаць..."

"Ведаем мы вашы падручнIкI..."

"Яго павялI, — успамIнала НIна Аляксандраўна. — Ён пайшоў, не схIлIўшы галавы. РазвIтваючыся, пацалаваў мяне, усмIхнуўся I сказаў: "Супакойся, усё будзе добра". Я нIчога не магла адказаць, была як каменная. З бацькамI, сястрой МIльдай I дзецьмI не далI развIтацца..." [I].

[I] Кнорина-Жигалова Н.А., член КПСС с I926 г. Отец и друг. Воспоминания о В.Г.Кнорине.-Нявыданы рукапIс. Захоўваецца ў архIве аўтара.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

28 ліпеня 1938 г. Ваенная калегія Вярхоўнага суда СССР асудзіла В.Г.Кнорына да растрэлу па абвінавачванню ва ўдзеле ў права-трацкісцкай, антыкамінтэрнаўскай арганізацыі, антысавецкай нацыяналістычнай латышскай арганізацыі, падтрымцы сувязей з шэрагам разведак. 29 ліпеня 1938 г. прыгавор прыведзены ў выкананне.

Сфальсіфікаваная справа была перагледжана ў 1955 г. Ваенная калегія Вярхоўнага Суда СССР 30 лістапада 1955 г. пасмяротна рэабілітавала В.Г.Кнорына. 23 снежня 1955 г. Камісія партыйнага кантроля пры ЦК КПСС аднавіла яго ў радах КПСС.

Вобразна кажучы, В.Г.Кнорын з'яўляўся адным з тых чырвоных латышскіх стралкоў, што, страціўшы ў гады першай сусветнай вайны сваю родную Латвію, аддавалі ўсю моц сваіх сэрцаў сацыялістычнай рэвалюцыі ў Расіі, хто паверыў у Леніна, не здрадзіў яму і чырвонаму сцягу, пранесшы вернасць праз усе жорсткае і пакутлівае жыццё.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## Літаратура


Ленин В.И. Критические заметки по национальному вопросу // Полн. собр.. соч. - Т.24.

Материалы XXVII съезда Коммунистической партии Советского Союза. - М.: Политиздат, 1986. - 352 с.

Материалы XIX Всесоюзной конференции Коммунистической партии Советского Союза, 28 июня -- 7 июля 1988 г. - М.: Политиздат, 1988. - I60 с.

Дорогой Октября, курсом революционного обновления в единой семье народов СССР / Доклад Е.Е.Соколова на торжественном заседании, посвященном 70-летию образования БССР и Компартии Белоруссии // Сов. Белоруссия. - 1988. - 3I дек.

По воле народа. Из истории образования Белорусской ССР и создания Коммунистической партии Белоруссии / Документы и материалы. - Мн.: Беларусь, 1988. - 255 с.

Большевики Белоруссии в борьбе за победу Октября. - Мн.: Беларусь, 1987. - 272 с.

Путем борьбы и труда. - Мн.: Беларусь, 1989. - 240 с.

Башко П.К. Советы рабочих, солдатских и крестьянских депутатов Белоруссии (март -- октябрь 1917 г.) - Мн.: Наука и техника, 1987. - 256 с.

Игнатенко И.М. Беднейшее крестьянство -- союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии. - Мн.: Наука и техника, 196I. - 497 с.

Игнатенко И.М. Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии. - Мн.: Наука и техника, 1986. - 344 с.

Игнатенко И.М. Великий Октябрь в судьбах белорусского народа. - Мн.: Беларусь, 1987. - 3I9 с.

Круталевич В.А. Рождение Белорусской Советской республики: На пути к провозглашению республики (окт. 1917 -- дек. 1918 гг.). - Мн.: Наука и техника, 1975. - 335 с.

Круталевич В.А. Рождение Белорусской Советской республики (Про-


ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

возглашение Республики. Развертывание национально-государственного строительства. Нояб. 1918 — февр. 1919 гг.). - Мн.: Наука и техника, 1979.

Кузнецов Н.В. В.Г.Кнорин. Страницы биографии. - Мн.: Беларусь, 1979. - 174 с.

Нестеренко Е.И., Осмоловский В.П. Советы Белоруссии, окт. 1917 -- янв. 1919 г. - Мн.: Наука и техника, 1989. - 232 с.

Сташкевич Н.С. Приговор революции. Крушение антисоветского движения в Белоруссии (1917--1925). - Мн.: Университетское, 1985. - 338 с.

Селиванов П.А. А.Ф.Мясников. Страницы биографии. - Мн.: Беларусь, 1986. - 80 с.

---

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Мікалай Васільевіч Кузняцоў

ЗМАГАР ЗА НАРОДНАЕ ШЧАСЦЕ
(Да 100-годдзя з дня нараджэння В.Г.Кнорына)

Адказныя за выпуск:
ст.рэферэнт А.Г.Мурнева
ст.рэферэнт В.П.Сарванава

---

Падпісана да друку 18.05.1990 г. Фармат 60х84 I/16.
Папера тып.№ I. Афсетны друк. Ум.друк.арк. 1,2. Ум.фарб.адб. 1,2.
Ум.выд.арк. 1,2. Тыраж 1000 экз. Зак. № 93 Цана 5 к.
Праўленне таварыства "Веды", 220600, г.Мінск, Ленінскі пр., 44.
Надрукавана на ратапрынце праўлення таварыства "Веды" БССР.
г.Мінск, вул.Акадэмічная, 15а.

5 к

2020

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З ПОУНЫМ ТЭКСТАМ ДАКУМЕНТА
МОЖНА АЗНАЕМІЦЦА У БІБЛІЯТЭЦЫ